3. Шабанова Т. Д. Предложение и его лимитативные модели : учеб. пособие к спецкурсу. – М. : Моск. гос. пед. ин-т, 1985. – 82 с.

4. Carlson K. Paralelism and prosody in the processing of ellipsis sentences. – New York ; London : Routledge, 2002. – 227 p.

5. Лекант П. А. К проблеме неполных предложений в русском языке // Учен. зап. – М., 1963. – Т. 139, вып. 9 : Русский язык и литература. – С. 43–49

6. Золотова Г. А. Коммуникативные аспекты русского синтаксиса. – М. : Наука, 1982. – 368 с.

7. Vychodilová Z., Zimek R. Elipsa jako jeden ze způsobu neexpliciního vyjadřování obsahovych prvků v jazyce. – Olomouc : [s.n.], 1988. – 231 s.

8. Колосова Т. А. Русские сложные предложения асимметричной структуры. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1980. – 164 с.

9. Hausperger B. Schprachökonomie in Grammatik und Pragmatik : die Ellipse. – München : Utz, 2003. – IX, 327 s.

10. Uniszewska A. The nature of linguistic processes determining the applica-bility of nomilizations applied to strings NP-COP-AP // Glotto-didactica. – 2001. – Vol. 29. – P. 139–147.

УДК 811.161.'34

В.П. Русак, д-р філалагічных навук
(ЦДБКМЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

# МАРФАНАЛАГІЧНЫ ПРЫНЦЫП КЛАСІФІКАЦЫІ НАЗОЎНІКАЎ

У субстантыўным словазмяненні беларускай мовы шырока прадстаўлены чаргаванні ў зыходзе асноў, якія выклікаюць адрозненні словаформ. На іх падставе назоўнікі разбіваюцца на марфаналагічныя класы (МФЛ) скланення, якія вызначаюцца па кансанантнай аснове Н. склону адз. ці мн. (для pl. t.). Вызначаюць 4 тыпы зыходнага варыянту асновы (ЗВА): на цвёрды зычны: *грыб, вясна, гром, балота, цяпло;* на мяккі зычны: *зямля, хвоя, радасць, дзень, край, шчасце;* на зацвярдзелы зычны: *мяжа, веліч, глуш, дождж, мора, сініца;* на заднеязычныя **г**, **к**, **х**: *кніга, воблака, яблык, дакопкі, рэха, гарох* [1, с. 345–375].

Пры правядзенні класіфікацыі па вар'іраванні субстантыўных словаформ, прымяняецца прыём мадэліравання, які дазваляе выявіць заканамернасці суб-стантыўнага словазмянення. Кожная мадэль уключае назоўнікі з аднолькавым размеркаваннем канцавых

элементаў асновы. Альтэрнант **$A_1$** – мінімальны мар-фаналагічны сегмент асновы Н. склону, прыняты за зыходны, які можа знаходзіцца ў адносінах вар’іравання з другім мінімальным сегментам, з сімвалічным абазначэннем: **Т** – цвёрды зычны, **Р** – губны зычны, **С** – свісцячы, **И** – шыпячы, **К** – заднеязычны, **V** – галосны, **Ш** – нуль гука; тып чаргавання – **ТЧ <Т ~ Т’>;** альтэрнацыйны рад – **АР $A_1$** ~ **$A_2$** ~ **$A_3$** . У залежнасці ад устанаўлення тоеснасці/ нятоеснасці фанемнага складу асновы канстатуецца наяўнасць або адсутнасць марфаналагічнага чаргавання, на падставе чаго і выдзяляюцца адпаведныя МФЛ класы назоўнікаў. Пры ўстанаўленні АР і ТЧ, характэрных для кожнага асобна-га альтэрнацыйнага рада, улічваецца, што ў залежнасці ад рэальна існуючых у мове назоўнікаў кожны тып чаргаванняў можа быць рэалізаваны не заўсёды поўным для беларускай мовы наборам канкрэтных чаргаванняў. Напр., у назоўніках жан. роду (*нага*, *рука*, *хата*) тып чаргавання **<К ~ С>** прадстаўлены трыма альтэрнацыйнымі радамі ў Д. і М. адз. ліку **<г ~ з’>**, **<к ~ ц>**, **<х ~ с’>**, у той час як гэты ж тып чаргавання ў назоўніках муж. роду (*рог*, *гарох*) рэалізаваны толькі дзвюма альтэрнацыямі ў словаформах М. адз. ліку **<г ~ з’>**, **<х ~ с’>**.

Схема кожнага альтэрнацыйнага рада не заўсёды можа быць рэальна праілюстравана поўным наборам канкрэтных чаргаванняў. Як прыклад возьмем тып чаргавання **<К ~ С ~ К’>**, што рэалізуецца АР **<г ~ з’ ~ к’>** і **<х ~ с’ ~ х’>**, якія характарызуюць назоўнікі муж. роду з асновай на заднеязычныя, і тып чар-гавання **<Т ~ Т’~ Т>**, што рэалізуецца карэляцыямі па “цвёрдасці ~ мяккасці” **<б ~ б’ ~ б>**, **<в ~ в’ ~ в>**, **<д ~ дз’ ~ д>** ... усяго 11 пар, якія характарызуюць назоўнікі муж. роду з цвёрдай асновай. Зразумела, што ў якасці ілюстрацый будуць разгледжаны розныя ў колькасных адносінах альтэрнацыі. У тых выпад-ках, калі назоўнікі з адным тыпам чаргавання ўтвараюць словаформы з рознымі флексіямі, тады прыводзіцца іх поўны пералік, як пры ўтварэнні форм М. адз. ліку назоўнікамі на заднеязычныя: (на) *дарозе,* (аб) *дачцэ,* (у) *лодцы, эпосе.*

У залежнасці ад таго, як у асновах назоўнікаў размяркоўваюцца члены альтэрнацыйнага рада, рэалізуемыя кансанантнымі чаргаваннямі і чаргаваннямі з нарашчэннем і ўсячэннем асноў, складзена 13 словазмяняльных МФЛ класаў.

**1 МФЛ клас**. Па гэтым тыпе змяняюцца назоўнікі з цвёрдай асновай муж. роду, якім уласціва ў зыходным варыянце асновы нулявая флексія, і назоўнікі ніякага роду з флексіяй **-а**, **-о**: *дуб*, *лес*, *матыў*, *флот* і *рэшата*, *дзіва*, *верацяно*, *памяло*. Неасабовым назоўнікам муж. роду ўласціва нулявая флексія ў Н. і В. склонах адз.

ліку (*сустаў*, *мёд*), а ў М. адз. ліку цвёрдая фанема праяўляецца ў сваім мяккім варыянце ((аб) *апекуне*, *грузе*, *дзедзе*, *боце*).

Назоўнікі, у якіх ЗВА заканчваецца на **-ал**, **-ал’**, **-ел**, **-ол**, **-ан**, **-он**, **-ён**, **-ен**, **-ен’**, **-ар**, **-ор**, **-ёр**, **-ер**, **-ос**, **-ет**, утвараюць формы ўскосных склонаў з выпа-дзеннем галосных /**а**/, /**е**/, /**о**/: **кашаль ~ кашлю, *снежань ~ снежня, *рубель ~ рубля, *асёл ~ асла, *лён ~ ільну, *пень ~ пня, *сябар ~ сябра, *віхор ~ віхра, *бабёр ~ бабра, *вецер ~ ветру, *хрыбет ~ хрыбта.* Словаформам такіх назоўнікаў уласцівы два тыпы альтэрнацый **<Т ~ Т’>** і **<V ~ Ш>**, таму яны вылучаюцца ў асобны падклас **Б** і пазначаюцца зорачкай* злева ад словаформы Н. склону, для канстатацыі чаргаванняў галоснай фанемы з нулём **Ш** (**сон ~ сна*).

**2 МФЛ клас**. Назоўнікі характарызуюцца захаваннем цвёрдага варыянта асновы ва ўсіх словаформах адз. і мн. ліку, акрамя форм Д. і М. склону адз. ліку, дзе адзначаецца мяккі варыянт той жа фанемы. Па тыпе чаргавання **<Т ~ Т'>** змяняюцца назоўнікі з цвёрдай асновай жан. роду з флексіяй **-а**: *хата, бяроза, пчала, дзяс*на.* Гэты тып чаргавання ўласцівы назоўнікам дзвюх структурных мадэлей зыходу асноў: **<VCV>** і **<$С_1$Ш$С_2$>**. Назоўнікам са структурай **<VCV>** уласцівы канцавы цвёрды зычны зыходнай асновы, які паслядоўна замяняецца мяккім адпаведнікам перад флексіямі Д. і М. склонаў адз. ліку. Назоўнікам са структурай **<$С_1$Ш$С_2$ >** да таго ж уласціва аднаўленне галоснага ў Р. склоне мн. ліку: *сас*на ~ сосен, бараз*на ~ баразён.* Галосныя /**е**/ і /**о**/ аднаўляюцца толькі пры наяўнасці нулявой флексіі ў гэтым склоне.

Устаўныя галосныя /**а**/, /**е**/ аднаўляюцца ў Р. склоне мн. ліку таксама і ў назоўніках жан. роду з мяккай (марфаналагічна немаркіраванай) асновай: *аглоб*ля, кроп*ля, суш*ня, кух*ня, малатар*ня, сот*ня, зям*ля, майстэр*ня.*

**3 МФЛ клас**. Па характары суаднясення асноў гэтага класа змяняюцца тры назоўнікі: *сусед, калена, чорт*. Цвёрды варыянт асновы захоўваецца ў Н. – Т. адз. л., замяняецца на мяккі варыянт у М. адз. л. і ва ўсёй парадыгме мн. л.

**4 МФЛ клас**. Для назоўнікаў гэтага скланення характэрна заднеязычная ў канцы асновы і нулявая флексія або флексія **-а**, **-о**. Безасабовыя (*залог, банк, страх*) і асабовыя (*васьміног*, *будаўнік*, *пастух*) назоўнікі муж. роду на заднеязычныя /**г**/, /**к**/, /**х**/ пры нулявой флексіі, а таксама назоўнікі ніякага роду з флексіямі **-а**, **-о** і зыходным варыянам асновы на заднеязычны /**к**/ (*воблака, ачко*) складаюць гэты клас. Для парадыгмы безасабовых назоўнікаў муж. і ніякага роду ўласцівы мяккія заднеязычныя /**г’**/, /**к’**/, /**х’**/ у Н. і В. мн.

л. (*даўгі, медзякі, шляхі*), а асабовым – толькі ў Н. мн. л. (*хірургі, мастакі, патрыярхі*). Па гэтым класе суаднясення асноў **<К ~ К’>** змяняюцца і назоўнікі, ва ўскос-ных словаформах якіх адбываецца выпадзенне суфіксальных галосных /**о**/, /**а**/: *агурок ~ агур*ка, бычок ~ быч*ка, пастушок ~ пастуш*ка, абутак ~ абут*ку, напітак ~ напіт*ку, матылёчак ~ матылёч*ка.* Змена канцавой структуры **<$C_1VC_2$>** на **<$C_1$Ш$C_2$>** характэрна для назоўнікаў, у якіх **<$C_2$>** – заднеязычная /**к**/: *пасашок, дружок, кавылёк, пясок.*

**5 МФЛ клас.** Змяняюцца ўласнабеларускія назоўнікі муж. роду на заднея-зычныя /**г**/, /**х**/ і нулявую флексію ў зыходным варыянце асновы, у якіх перад флексіяй /**е**/ М. адз. л. фіксуецца пераход заднеязычных у свісцячыя: *бераг ~* (на) *беразе, кажух ~* (у) *кажусе, гарох ~* (у) *гаросе*. Чаргаваннем **<К ~ С ~ К’>** маркіраваны ўласнабеларускія назоўнікі, якім пры словазмяненні ўласцівы дзве пары альтэнацыйных радоў: **<г ~ з’>**, **<х ~ с’>** *снег ~* (у) *снезе, верх ~* (на) *версе, рог (*каровы*) ~* (на) *розе;* **< г ~ г’>**, **< х ~ х’>** *бераг ~ берагі, гарох ~ гарохі.* Першая пара альтэрнацыйных радоў супрацьпастаўляе словаформы адз. л. (Н. – Т. ~ М.), другая – адлюстроўвае апазіцыю адз. ~ мн. л. (Н. адз. ~ Н., В. мн. л.).

**6 МФЛ клас.** Па мадэлі гэтага класа скланяюцца назоўнікі з ЗВА на заднеязычныя /**г**/, /**к**/, /**х**/ і флексіяй /**-а**/. Пры скланенні яны ўтвараюць дзве пары альтэрнацыйных радоў: **<г ~ з>**, **<к ~ ц>**, **<х ~ с>** і **<г ~ г’>**, **<к ~ к’>**, **<х ~ х’>**. Назоўнікі гэта класа са збегам зычных у зыходным варыянце асновы, апошні з якіх /**к**/, аднаўляюць беглы галосны ў Р. мн. ліку. Структура канцавых элементаў гэтых назоўнікаў **<$C_1VC_2$ >** і **<$C_1$Ш$C_2$ >**. Для назоўнікаў гэтага класа характэрна чаргаванне віду: ТЧ **<К ~ С ~ К’>.**

Назоўнікі са структурай **<$C_1$Ш$C_2$>**, у якіх спалучэнне **<$C_1C_2$>** зыходнага варыянту асновы выражана збегам зычных **бк**, **дк**, **жк**, **зк**, **йк**, **лк**, **мк**, **нк**, **пк**, **рк**, **ск**, **тк**, **ўк**, **чк**, **шк**, паслядоўна ў родным склоне множнага ліку аднаўляюць ўстаўны галосны /**а**/: *груб*ка ~ грубак, дамасед*ка ~ дамаседак, сыраеж*ка ~ сыраежак, падказ*ка ~ падказак, лай*ка ~ лаек, перапёл*ка ~ перапёлак, незнаём*ка ~ незнаёмак, макавін*ка ~ макавінак, скрып*ка ~ скрыпак, цукер*ка ~ цукерак, пралес*ка ~ пралесак, павест*ка ~ павестак, пастаў*ка ~ паставак, спявач*ка ~ спявачак, усмеш*ка ~ усмешак.* Па гэтай мадэлі скланяюцца і назоўнікі агульнага роду з асновай на заднеязычны: *калека, туляга, задавака, свед*ка.* У гэтым класе акцэнтная крывая адрознівае пэўны спіс назоўнікаў з асновай на **к-** і месцам націску на флексіі альбо на аснове (пры абавязковым чаргаванні **<к ~ ц>** у Д. і М. адз. л.), дзе пад націскам ужываецца флексія **-э**: *мука ~ муцэ, лука ~*

*луцэ, рака ~ рацэ, траска ~ трасцэ;* без націску – флексія **-ы**: *гутарка ~ гутарцы, дошка ~ дошцы, чайка ~ чайцы, усмешка ~ усмешцы.*

**7 МФЛ клас.** Па ім змяняюцца назоўнікі з марфаналагічна немаркіра-ванай канцавой структурай **<С$_1$ШС$_2$>**. Марфаналагічна немаркіраваным з'яўля-ецца таксама зыходны варыянт асновы на мяккую зычную **<С$_2$>** у назоўніках м., ж., н. роду: *каваль, агонь, вішня, зямля, песня, шчасце, жаданне*.

Назоўнікі, у якіх канцавая структура **<С$_1$ШС$_2$>** зыходнага варыянта асновы заканчваецца збегам зычных **бл'**, **зн**, **пл'**, **мл'**, **мй**, **жн'**, **шн'**, **тн'**, **сн**, **сн'**, **фл'**, **рн'**, у Р. склоне мн. ліку пры нулявой флексіі аднаўляюць беглы галосны: *аглоб*ля ~ аглабель, кроп*ля ~ кропель, зям*ля ~ зямель, сям*'я ~ сямей, тамож*ня ~ таможань, канюш*ня ~ канюшань, сот*ня ~ соцень, каф*ля ~ кафель, пякар*ня ~ пякарань, кнігар*ня ~ кнігарань.* Для іх характэрны тып чаргавання: ТЧ **<Ш ~ V>** = **А$_1$** (Н.–М. адз., Н., Д.–М. мн.) ~ **А$_2$** (Р. мн.).

**8 МФЛ клас.** У гэтым тыпе скланення аб'яднаны назоўнікі, якія маюць няпоўную словазмяняльную парадыгму. У назоўніках гэтага скланення адсут-нічае словазмяняльная парадыгма адз. ліку, таму яны атрымалі назву множналі-кавыя назоўнікі (pl. t.). Для іх характэрны ТЧ **<К'~ К>,** у якім **А$_1$** (Н., В. мн.) ~ **А$_2$** (Р., Д., Т., М. мн.). Марфаналагічна маркіраванымі па "цвёрдасці ~ мяккасці" канцавых зычных асновы з'яўляюцца парадыгмы pl. t. на заднеязычныя: *задворкі, заняткі, ходзікі, скокі, ціскі, духі, абцугі, віл*кі, зёл*кі, начоў*кі.* Мяккая зычная ЗВА ва ўскосных склонах становіцца цвёрдай, назоўнікі, у якіх **<С$_2$>** (апошні зычны асновы) – заднеязычны /**к**/, часцей за ўсё аднаўляюць беглы галосны ў Р. мн. л.: *вячор*кі ~ вячорак, абдым*кі ~ абдымак, басанож*кі ~ басаножак, брат*кі ~ братак,* але *ападкі ~ ападкаў.* Гэта з'ява адзначаецца і ў назоўніках з іншай асновай: *каноп*лі ~ канапель, граб*лі ~ грабель.*

**9 МФЛ клас.** У яго ўваходзіць два назоўнікі: *вока* і *вуха,* якія скланяюцца па тыпе **<К ~ И>**. На марфемным шве адбываецца чаргаванне заднеязычных з шыпячымі, якое супрацьпастаўляе пазіцыі ўсіх форм адз. формам мн. ліку. Тып скланення выражаны альтэрнацыямі: **<к ~ ч>** *вока ~ вочы*; **<х ~ ш>** *вуха ~ вушы.*

**10 МФЛ клас.** Па ім змяняюцца назоўнікі жан. роду, якія ў ЗВА маюць на канцы перад нулявой флексіяй зычную фанему. Структура ЗВА назоўнікаў мае выгляд **<С$_1$VС$_2$>**. У Т. скл. зычны **<С$_2$>** на марфемным шве падаўжаецца: *шчолач ~ шчолаччу, бездараж ~ бездаражжу, прыстань ~ прыстанню.* Маркіраванымі аказваюцца словаформы Т.: *мышшу*, *соллю*, *залежжу*, *меддзю*, *ноччу*, *граззю,*

*рыссю*. Пры структуры зыходу асновы на збег зычных падаўжэння не адбываецца: *аповесць, радасць, чвэрць.*

**11 МФЛ клас.** Так змяняюцца назоўнікі жан. роду, якія ў зыходным варыянце асновы маюць перад нулявой флексіяй губны зычны ці **/р/**. Структура зыходнага варыянта асновы гэтых назоўнікаў мае выгляд **<$C_1VC_2$>**. У Т. склоне зыходная аснова ўскладняецца /j/, адбываецца далучэнне /j/ да канцавога сег-мента **<$C_2$>**: *глыб ~ глыб /j/-у, шыр ~ шыр/j/-у, верф ~ верф/j/-у.*

**12 МФЛ клас.** Назоўнікам уласціва нарашчэнне зыходнай асновы ўстаўкамі віду **<VC>: 1)** ***падклас*** абазначае маладых істот: *ільвяня, сабаляня, бусляня;* маюць канчаткі **-я/-ё-**: *кураня* і *куранё, парася* і *парасё*; у Р., Д., М. адз. л. – устаўка **-яц-**, якая ўтрачваецца ў В. і Т., а ўсе склоны мн. л. маюць устаўку **-ят-**: *цяля(ё) ~ цяляці ~ цяляты*; **2)** ***падклас*** утвараюць назоўнікі *імя*, *племя*, *стрэмя*, *маці*. Першыя тры назоўнікі могуць мець формы з нарашчэннем устаўкай **-ен-** у Р., Д., Т., М. адз. л.; у мн. л. толькі назоўнік *племя* мае формы з устаўкай **-ён-**; назоўнікі *імя* і *стрэмя* могуць мець як формы з устаўкай, так і без: *імя ~ імені ~ імёны* (*імён*), *стрэмя ~ стрэмені ~ страмёны* (*страмён*), *племя ~ племені ~ плямёны*. Назоўнік *маці* атрымлівае ўстаўку **-ер-** ва ўскосных склонах адз. л., акрамя В., і ва ўсіх склонах мн. л.: *маці ~ мацеры.* Назоўнік *маці* можа ўжывацца без устаўкі **-ер-** і ва ўсіх склонах адз. і мн. л. мець форму, якая супадае з формай Н. склону. **3)** ***у падклас*** уваходзіць назоўнік *неба*, які можа атрымліваць устаўку **-ёс-** ва ўсіх склонах: *нябёсы ~ нябёс ~ нябёсам.* Па тыпу назоўніка *неба* з устаўкай **-ёс-** скланяецца ў мн. л. назоўнік *калёсы*. **4)** ***у падклас*** уваходзіць назоўнік *дзяўчына*, у ім формы мн. л. утвараюцца ад асновы на **-ат-**, г. зн. фіналь **-ын-**(а) замяняецца на фіналь **-ат-**(ы): *дзяўчына ~ дзяўчаты.*

**13 МФЛ клас.** У яго ўваходзяць назоўнікі, у якіх адсякаецца фіналь ЗВА. Тып чаргавання назоўнікаў **<$C'_1VC_2$ ~ $C'_1$Ш>** паказвае, што варыянт словазмя-няльнай парадыгмы абумоўлены ўсячэннем канцавога сегмента зыходнай асновы. У словаформах мн. л. адбываецца ўсячэнне фіналі **<$VC_2$>**: *мінчанін ~ мінчане, славянін ~ славяне, баярын ~ баяры, гараджанін ~ гараджане.*

Праведзеная класіфікацыя назоўнікаў дазволіла ўстанавіць, што зонай марфаналагічных змен з'яўляецца канцавы сегмент зыходнай асновы, які звычайна мае выгляд **<$C_1VC_2$>**. Чаргаванні могуць закранаць любы кампанент гэтага сегмента асновы: *лод*****ка*** *~ лод**цы**, *дзяц**ел*** *~ дзятШла, *дзе**нь*** *~ дзё**н**.* Аднак першы зычны сегмента **<$C_1$>** змяняецца толькі ў словах, у якіх аснова маркіравана **Ш** (нулём): *бара/зШн/а ~ бара/**з'**/ён.* Значыць, асноўная колькасць чаргаванняў у

парадыгмах назоўнікаў закранае апошні зычны асновы – <**С$_2$**>. У гэтай пазіцыі ў ЗВА могуць выступаць зычныя фанемы, якія абавязкова чаргуюцца з другімі зычнымі ў любой парадыгме, зычныя, якія чаргуюцца ў асобных парадыгмах і зычныя, якія не чаргуюцца ні ў адной парадыгме. Да першай групы належаць зычныя класу **Т** (цвёрдыя) і **К** (заднеязычныя); да другога – **С** (свісцячыя) і **И** (шыпячыя); да трэцяга – класа **Р** (губныя) і **Т'** (мяккія). Гэта ж размеркаванне адносіцца і да галосных у сістэме парадыгм назоўнікаў: **Ш** чаргуецца заўсёды ў любой парадыгме, галосныя /**а**/, /**о**/, /**е**/ мо-гуць чаргавацца ў адных пазіцыях і не ўступаць ў чаргаванне ў другіх; галосныя /**і**/, /**у**/ не чаргуюцца з іншымі галоснымі ні ў адной парадыгме назоўнікаў. Такім чынам, калі аснова назоўніка заканчваецца на адну з фанем першай ці другой катэгорый зычных, нуль галоснай **Ш**, які чаргуецца з /**а**/, /**о**/, /**е**/, тады яна, безумоўна, належыць да зменных асноў і падлягае класіфікацыі. На падставе разгледжаных прымет выдзелена **13** марфаналагічных класаў назоўнікаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Русак, В.П. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы / В. П. Русак. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 429 с.

УДК: 808.26-54

І.У. Ялынцава, заг. аддзела, канд. філал. навук
(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск)

## АБ МНОЖНАСЦІ МАТЫВАЦЫІ КАЛАРАТЫВАЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У сістэме сінхроннага словаўтварэння сустракаюцца выпадкі, калі адно матываванае слова ў адным і тым жа значэнні (ці адных і тых жа значэннях) можа быць суаднесена не з адной, а з дзвюма і нават больш матывавальнымі асновамі. Гэта значыць, што такія словы маюць не адну, а дзве і больш словаўтваральныя структуры. У такіх выпадках, калі адно матываванае слова можа разглядацца як утворанае ад дзвюх матывавальных асноў, прынята гаварыць пра множнасць матывацыі [1, с. 96]. Параўн. у Л. М. Шакуна: “Некаторыя вытворныя асновы могуць знаходзіцца ў адносінах вытворнасці не з адной, а з дзвюма (часам і больш) утваральнымі асновамі. Такія